А. І. ЛОЙКА

# ІДЭІ М. ГУСОЎСКАГА І АКТУАЛЬНЫЯ ПРАБЛЕМЫ СУЧАСНАГА ТЭХНАГЕННАГА СВЕТУ

Творчасць М. Гусоўскага (1480—1540) дагэтуль не стала аб'ектам пільнай увагі філосафаў, хоць у ёй выяўляюцца праблемы, характэрныя і для сучаснага тэхнагеннага грамадства.

Перш за ўсё ўдакладнім сэнс паняцця «тэхнагенны свет». Для гэтага скарыстаем пэўную аналогію паняццяў, што адлюстроўваюць бачанне чалавекам прыроды. Так, у паняцці «біясфера» зафіксаваны факт уплыву жывых арганізмаў на планету; «наасфера» — роля чалавека як мыслячай істоты ў змяненні выгляду планеты. «Тэхнагенны свет» адлюстроўвае наяўнасць на планеце не толькі прыроднага, але і штучнага асяроддзя, дзе дамінуе тэхніка і тэхналогія.

Штучнае асяроддзе як тэхнічная сістэма, што складаецца з акрэсленай сукупнасці элементаў, створана чалавекам і не здатная без яго ўдзелу да самаабнаўлення і самазберажэння. Для яе характэрны пэўны тып сувязей. Ён задаецца асаблівасцямі штучных аб'ектаў, выступаючых у якасці падсістэм. На ўзроўні вытворчасці сувязі выступаюць у форме вытворчай інфраструктуры, а іменна: сеткі нафта-, газа-, водаправодаў, ліній электраперадач, транспарту, дарог, тэхнічных станцый абслугоўвання. У невытворчай сферы існуе інфраструктура, якая задавальняе патрэбы чалавека ў цяпле, вадзе, электраэнергіі, транспарце, сувязі.

Тэхнічныя падсістэмы, дзякуючы унікальным магчымасцям інфармацыйных тэхналогій, ператварыліся ў адзіную штучную сістэму. Апошняя прад'яўляе чалавеку зусім іншы, чым у арганічным свеце, кодэкс паводзін і дзейнасці. Адно з важных месц у ім займае патрабаванне адказнасці, якое канкрэтызуецца неабходнасцю масавай тэхнічнай адукацыі, развіцця індывідуальных асаблівасцей чалавека.

У аснове масавай тэхнічнай адукацыі ляжыць патрабаванне больш глыбокага вывучэння ў тэхнічных ВНУ этыкі адказнасці, экалагічных аспектаў дзейнасці[1]. Фарміраванне індывідуальнага пачатку арыентавана, у першую чаргу, на выпрацоўку натуральнага і цэннаснага дачынення чалавека да сябе, усведамлення таго, што ў кожным з нас прадстаўлен лёс чалавецтва (Ж. -П. Сартр). Наколькі гэта актуальна паказала чарнобыльская катастрофа. Яна ж паказала неабходнасць нацыянальнага, звязанага з пачуццём роднага на гэтай зямлі, дачынення да прыроды.

Побач з паняццем «тэхнагенны свет» у літаратуры выкарыстоўваецца паняцце «тэхнагенная цывілізацыя». Яно канкрэтызуе ўяўленне аб тэхнічнай дзейнасці чалавека ў прасторы і часе ў адпаведнасці з пэўнай сістэмай цэннасцей. Асабліва наглядна яны праяўляюцца пры параўнанні цэннасцей традыцыйнай і тэхнагеннай цывілізацый. Так, на думку В. С. Сцёпіна, тэхнагенную альбо заходнюю (па месцы ўзнікнення) цывілізацыю адрознівае інтэнсіўнае развіццё, заснаванае на прызнанні вышэйшай цэннасці інавацый, арыгінальнасці новага, аўтаноміі асобы. Традыцыйныя грамадствы аддаюць перавагу не інавацыям, а стабільнасці, узнаўленню ўжо склаўшыхся структур грамадскага жыцця, стэрэатыпам, карпаратыўнай свядомасці[2]. Тэхнагенная цывілізацыя выпрацавала дастаткова эфектыўны механізм самаабнаўлення, якому адпавядае яе імкненне да новага, творчага. У аснове гэтага механізма ляжаць два адкрыцці. У сферы рэгуляцыі сацыяльных сувязей гэтакім стала дэмакратыя. У сферы пазнання свету — тэарэтычная навука[3].

У XVI ст. тэхнагенная цывілізацыя набыла выгляд вельмі дынамічнай і агрэсіўнай сістэмы, што праявілася ў актыўным асваенні заходнееўрапейцамі традыцыйных культур. Дзякуючы гэтаму яны атрымалі неабходны для тэхнагеннай актыўнасці капітал. Пакуль Беларусь знаходзілася ў заходнееўрапейскім рынку, яна мела значныя магчымасці для адукацыі, культывавання новых цэннасцей. Важную ролю ў асвеце беларусаў адыграла сістэма еўрапейскай універсітэцкай адукацыі. Тыя з іх, хто пабываў у краінах Заходняй Еўропы, задумаўся аб перспектывах уваходжання бацькаўшчыны ў сістэму тэхнагеннага свету. Найбольш сугучныя становішчу Беларусі ў Еўропе ў канцы XX ст. ідэі выказаў паэт і мысліцель Мікола Гусоўскі. Выхадзец з беларускага Прыдняпроўя, ён добра ведаў ментальныя асаблівасці землякоў. Апошнія характарызаваліся пэўнай архаікай поглядаў, што дало мысліцелю падставу зрабіць вывад: «Мы —

шчэ натоўп, грамада непісьменная, цемра»[4]. Аднак ужо з'явіліся людзі, якія авалодалі практыкай і цэннасцямі рынчнай гаспадаркі. Ён выдатна разумеў, што гэткіх яшчэ няшмат, слабы іх удзел і ў пераўтварэнні Беларусі. Значныя цяжкасці для іх дзейнасці ўяўлялі пастаянныя войны. Сваю асноўную задачу мысліцель бачыць, па-першае, у неабходнасці азнаёміць з Беларуссю як мага большую колькасць еўрапейцаў, паспавядаць ім аб бедах і праблемах сваёй радзімы. Дарэчы, у XX ст. заходнееўрапейцы ведаюць аб Беларусі амаль столькі ж, як і ў часы М. Гусоўскага. Гэта тычыцца палітыкі, эканомікі, культуры. Па-другое, вызначаючы мэту па-філасофску асэнсаваць цэннасці тэхнагеннага свету, найбольшую вагу ён надае філасофіі прыроды, філасофскай антрапалогіі, сацыяльнай філасофіі.

Філасофская канцэпцыя прыроды М. Гусоўскага практычна пакуль яшчэ не стала прадметам спецыяльнага даследавання, хаця па актуальнасці яна не ўступае канцэпцыі прыроды, выпрацаванай англійскай традыцыяй. Сутнасць яе выражана выказваннем Ф. Бэкана: «Веды — гэта сіла». Згодна з поглядамі англійскага мысліцеля, навуковыя веды неабходны чалавеку для стварэння з матэрыялу прыроды тэхнікі. Ужо ў Новы Час гэтая ідэя набыла форму пануючай парадыгмы тэхнагеннага мыслення. Негатыўныя вынікі яе праявіліся ў XX ст. у форме глабальных экалагічных праблем.

Канцэпцыя М. Гусоўскага альтэрнатыўная бэканаўскай у тым, што яна акцэнтуе ўвагу на прыродзе як роўным партнёры чалавека. Ён піша: «Зубр (галоўны сімвал прыроды — А. Л.), як мы лічым спрадвеку, хоць звер, але ж ратнік. Ён прызнае перамогу, здабытую чэсна — Сілай на сілу, урожкі, і мужнасць на мужнасць»[5]. Прыроду трэба не адгароджваць ад негатыўнай дзейнасці чалавека, а насупраць, рабіць апошнюю экалагізаванай, рацыянальнай. Інакш прырода стане ахвярай безгаспадарчасці. У такіх умовах «гінуць і рыба, і звер заніпто. Неаднойчы Я назіраў, як у нераст на іхніх валоках Рыба кішэла не толькі ў азерцах і рэчках, нават у лужынах — проста прасілася ў венцер і захлыналася»[6].

Такім чынам, згодна з думкай беларускага мысліцеля, прырода не столькі супрацьстаіць чалавеку, колькі патрабуе ад яго рацыянальных адносін, дастаткова эфектыўнай дзейнасці. Пры выкананні яе прырода спаўна аддасць чалавеку як разнастайнымі прадуктамі, так задавальненнем, тым больш, што чалавеку не столькі трэба іх ствараць, колькі проста карыстацца. «Нашы лясы — гэта наша скарбонка і свіран, Наша камора жывіцы, і дзёгцю, і ягад, Мёду і воску, куніцы і рознай дзічыны»[7]. Далейшае развіццё падзей на Беларусі паказала, што прыроднае багацце больш разбэшчвае грамадскую свядомасць, чым канцэнтруе ўвагу на важнасці перамен, звязаных з адносінамі да прыроды ў рамках тэхнагеннай цывілізацыі.

Тэхніка надала чалавеку пачуццё ўлады, панавання над прыродай. М. Гусоўскі ж турбаваўся, каб гэтае панаванне не дайшло да самагубства чалавека. Пачаткам такога самагубства для беларусаў стала масавае знішчэнне лесу — крыніцы асноўных нацыянальных багаццяў, нацыянальнай гордасці — дзеля таварнай вытворчасці зерня, што набыла шпаркае развіццё ва Усходняй Еўропе. Справа ў тым, што прадукты лесу давалі беларусам права на роўны абмен з еўрапейцамі, а таксама былі крыніцай эстэтычнай асалоды («Месцы ігрышчаў і гульбішчаў моладзі сельскай»). Але шлях быў выбраны іншы — шлях стварэння монакультурнай вытворчасці таварнага зерня ў магнацкіх гаспадарках. Гэтае развіццё зрабіла Рэч Паспалітую, у якую ўваходзіла Беларусь, залежнай ад прамысловых краін, якія на біржах Амстэрдама і Лондана ўстанаўлівалі цэны на зерне. Ужо ў XVII—XVIII стст. Рэч Паспалітая аказалася не ў сілах сапернічаць з вытворцамі таварнага зерня ў Новым Свеце, што і стала адной з прычын яе эканамічнага і палітычнага банкруцтва. Папярэджванні М. Гусоўскага аб катастрафічным уздзеянні на прыроду Беларусі нерацыянальнага развіцця тэхнагеннай цывілізацыі збыліся поўнасцю. Аварыя на Чарнобыльскай АЭС напомніла беларусам, што яны страцілі прыроду, уласна лес як важную крыніцу іх духоўнага свету, менталітэту. Хаця той жа лес мог стаць базай для сучаснай прамысловасці, падобнай па структуры да фінскай і шведскай.

Філасофская антрапалогія М. Гусоўскага актуальная тым, што ў ёй было канкрэтызавана ўяўленне аб чалавеку як суб'екце гісторыі. Згодна з апошнім, індывідуальнасць як свабода і адказнасць на ўзроўні канкрэтнага індывіда павінна дапаўняцца ментальнай індывідуальнасцю (адказнасцю за лёс бацькаўшчыны), яе адэкватнай прадстаўленасцю ў сям'і еўрапейскіх народаў. Мысліцель лічыў, што рэальным суб'ектам адносін у тэхнагеннай Еўропе стануць нацыі, якія будуць

прадстаўляць канкрэтныя эканамічныя арганізмы ў межах вызначанай тэрыторыі. Кожная нацыя як аўтаномная падсістэма ў рамках еўрапейскага падзелу працы нясе адказнасць за ўнутраныя працэсы, г. зн. свабодная ў выбары ўласнай стратэгіі і ў той жа час, як еўрапейская, павінна разлічваць на падтрымку ў выпадку пагрозы агульнаеўрапейскім інтарэсам.

Асаблівую ўвагу М. Гусоўскі надаў тэме самаарганізацыі нацыі як сукупнасці індывідуальнасцей, аб'яднаных агульным менталітэтам. У якасці мадэлі такой самаарганізацыі ён бачыў прававую дзяржаву, здольную супрацьстаяць агрэсіўным імкненням суседзяў. Нагадаем, што ў XVI ст. Беларусь у межах Вялікага княства Літоўскага была пагранічнай дзяржавай. За ёй пачыналіся тэрыторыі другіх рэгіянальных культур. Занепакоены лёсам роднай краіны, мысліцель не мог не марыць аб яе моцным і таленавітым кіраўніку. Ідэал такога дзеяча ён бачыў у асобе князя Вітаўта. Апошні займаўся не толькі праблемамі бяспекі Вялікага княства Літоўскага, але і прававымі пытаннямі. Ён рашуча змагаўся з бюракратычнымі праявамі ў судаводстве. «Прагнасць нажыцца пад шыльдаю варты закону, Сквапнасць — загрэбці кавалак у бліжняга з рота — Ён тыранічнымі сродкамі так пратараніў, Што на вякі нават завад іх вывеўся ў княстве»[8].

Хваляванне М. Гусоўскага, выкліканае праяўленнямі беззаконнасці ў дзяржаўнай (прававой) сістэме, сведчыць аб тым, што прававая і філасофская думка Беларусі ўжо ў XVI ст. была занепакоена праблемай эфектыўнасці дзяржаўнай арганізацыі грамадскага жыцця. Ініцыятывы, звязаныя з устараненнем недахопаў у судаводстве, дзяржаўным апараце знайшлі дастаткова плённы выраз у прававой рэформе, якая пачалася з выдання Судзебніка яшчэ ў 1468 г. і завяршылася падрыхтоўкай першага Статута Вялікага княства Літоўскага. Яго праект быў падрыхтаваны к 1522 г., а ў сілу статут уступіў 29 верасня 1529 г. На яго аснове быў створаны Статут 1566 г. Як піша Я. А. Юхо, «пасля прыняцця Статута 1566 г. кадыфікацыя і сістэматызацыя ўласна заканадаўства, заснаванага на звычайным праве, нашмат апярэдзіла падобную работу ў іншых феадальных дзяржавах. Гэта таксама сведчыць, што ў Вялікім княстве Літоўскім у той час грамадскія адносіны стаялі на даволі высокім узроўні і былі юрысты, падрыхтаваныя тэарэтычна і практычна...»[9]

На нашу думку, да гэтай ацэнкі трэба дадаць і тое, што Беларусь мела дастаткова добра распрацаваную філасофскую аснову тэорыі права ў выглядзе сацыяльнай філасофіі. У ліку найвыдатнейшых прадстаўнікоў апошняй — М. Гусоўскі, паколькі іменна ім была пастаўлена праблема дзяржавы як праблема арганізацыі грамадства, г. зн. дзяржава і права разглядаліся ім не як Богам дадзеныя чалавеку, а як мэта і вынік рацыянальнай дзейнасці апошняга.

Усе блокі грамадскага жыцця, на думку М. Гусоўскага, цесна звязаны. Нармальнае развіццё эканомікі ў рамках тэхнагеннага грамадства немагчыма без моцнай дзяржавы, рашэння палітычных задач. У сваю чаргу, эканоміка, дзяржава, грамадства не могуць існаваць без права як сістэмы, здольнай супрацьстаяць злоўжываннім чыноўнікаў, бюракратызацыі. Найбольшую эфектыўнасць, дзейснасць прававая сістэма можа праявіць толькі ў тым выпадку, калі яна функцыяніруе ў грамадстве, якое будуе свае адносіны да свету на рацыянальных асновах, розуме. Грамадства як сістэма не супрацьстаіць прыродзе, а ўключае апошнюю як цэннасць, як уласны элемент, непасрэдна ўплываючы на яго раўнавагу і стабільнасць. У кожнага грамадства ёсць не толькі свае эканамічныя, сацыяльныя, палітычныя, але і агульначалавечыя цэннасці («Войны! Злачынная справа вайны выклікае Гнеў мой, і слёзы, і боль» [10]).

Свой час М. Гусоўскі апярэдзіў не толькі разуменнем праблем грамадства, але і тым, што сацыяльную філасофію звязаў з больш фундаментальнай філасофскай праблемай — праблемай чалавека (філасофскай антрапалогіяй). У інтэрпрэтацыі апошняй чалавек увасабляе і зло, і дабро («Б'юцца князі-ваяводы, а стогнуць народы: Воіны ж гінуць у тых і другіх у сутычках, Што ім той смерд — наша гора і нашы пакуты?»[11]). Супярэчлівая прырода чалавека і вызначае комплекс тых праблем, што не страцілі сваёй вартасці і ў XX ст. М. Гусоўскі змог празорліва ўбачыць іх «вечны» характар і гэтым прадэманстраваў, што на Беларусі ў перыяд Адраджэння склалася традыцыя філасофствавання, аб'ектам якога сталі актуальныя праблемы тэхнагеннай цывілізацыі. Феномен М. Гусоўскага сведчыць і аб тым, што ён не выключэнне ў гісторыі бацькаўшчыны. Гэта дае падставы спадзявацца,

што Беларусь верне аўтарытэт еўрапейскай краіны і дасць сучаснаму свету сваё, арыгінальнае бачанне многіх праблем.

[1] Гл.: Л е н к Х. // Философия техники в ФРГ. М., 1989. С. 390—391.
[2] Гл: С т ё п и н В. С. Философская антропология и философия науки. М., 1992. С. 48—49.
[3] Там жа. С. 50.
[4] Г у с о ў с к і М. Песня пра зубра. Мн., 1981. С. 76.
[5] Там жа. С. 39.
[6] Там жа. С. 33.
[7] Там жа. С. 31.
[8] Там жа. С. 61.
[9] Ю х о Я. А. Кароткі нарыс гісторыі дзяржавы і права Беларусі. Мн., 1992. С. 170.
[10] Г у с о ў с к і М. Песня пра зубра. С. 41.
[11] Там жа. С. 75.

Р. Н. ДОЖДИКОВА

## ПРОБЛЕМА АМБИВАЛЕНТНОСТИ ТЕХНИКИ

Феномен техники приобретает в наше время поистине мистические очертания. «Демонизм» техники проявляется в том, что, созданная человеком, она выходит из-под его власти и начинает определять его судьбу, а также судьбу человечества. Фаустовский договор с научно-техническим прогрессом выражается в том, что нарастающая ущербность душевной жизни человека, нравственная и духовная деградация оказываются той ценой, которую вынужден платить человек за социально-бытовой комфорт. В этом проявляется амбивалентность техники, которая, с одной стороны, облегчает жизнь человека, а с другой, представляет собой реальную угрозу его существованию.

Тайна техники во многом заключена в самом этом понятии. В древней Греции téchnē означало, во-первых, искусство, во-вторых, многостороннее умение изготавливать полезные для жизни предметы, создавать искусственные, не существующие в природе объекты. М. Хайдеггер считал, что греческое слово téchnē семантически близко слову episteme. Оба они именуют знание в самом широком смысле, означают умение ориентироваться, разбираться в чем-то. Знание приносит ясность, оно есть раскрытие потаенности. Техника есть вид раскрытия потаенности, она есть про-из-ведение[1]. По утверждению В. Шадевальда, техника — это искусство во всякого рода производстве. Téchnē — такое знание и способность, которые направлены на производство и конструирование и, таким образом, занимают среднее положение между просто опытом или ноу-хау и теоретическим знанием[2]. К. Ясперс видел в технике совокупность действий знающего человека, направленных на господство над природой[3]. Э. Капп рассматривал технические орудия как проекции, продолжение и усиление человеческих органов. Развивая эту мысль, А. Хунинг говорит о том, что пока мы достигли зоологической стадии техники. Теперь мы приближаемся к поистине антропологической технике[4].

Н. Бердяев трактовал понятие «техника» в широком и узком смысле. В широком смысле «техника» — это индустрия, искусство, в узком смысле téchnē — значит фабриковать, искусно создавать. Существует не только промышленная техника, но и техника мышления, стихосложения, живописи, танца и даже духовной жизни. Так, йога — это своеобразная духовная техника[5]. Ф. Рапп также дает два определения техники: узкое и широкое. В первом случае техника заключает в себе конкретные материальные артефакты, создаваемые и используемые методами инженерной деятельности, во втором — техника распространяется на любого рода эффективную методологическую деятельность[6].

Обобщив рассмотренные определения, можно сказать, что техника — это искусственно созданные средства деятельности человека. С этой точки зрения различают пассивную и активную технику. Пассивная техника включает производственные помещения, железные дороги, мосты, каналы, телефон, радио, телевидение. Активная техника состоит из орудий (инструментов), машин и аппаратуры управления машинами. Орудия делятся на орудия умственного труда (компьютеры) и орудия жизнедеятельности человека (очки,